**ПЛЕСКАЧЭЎСКІ Юрый Міхайлавіч,** нарадзіўся 22.10.1943 г. у с. Садовае Цалінаградскай вобл., Казахстан. Доктар тэхнічных навук (1984), член-карэспандэнт Нацыянальнай АН Беларусі (1992), прафесар (1997).

У 1965 г. скончыў Кіеўскі політэхнічны інстытут. У 1969 г. паступіў у аспірантуру Інстытута механікі металапалімерных сістэм Акадэміі навук Беларусь У 1972 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю і быў абраны на конкурскай аснове на пасаду старшага навуковага супрацоўніка інстытута. У 1979 — 1989 гг. працаваў намеснікам дырэктара па навуцы. Са жніўня 1985 г. — адначасова загадчык лабараторыі. У сакавіку 1989 г. абраны загадчыкам аддзела адгезійных з'яў. Са студзеня 1991 г. — дырэктар інстытута. Аўтар каля 200 навуковых прац і публікацый, у т. л. 3 манаграфій, 2 брашур. Мае 76 вынаходніцтваў і 6 патэнтаў. Асноўныя пытанні навуковых даследаванняў адносяцца да механікі металапалімерных сістэм. Упершыню правёў класіфікадыю металапалімерных сістэм і асноўных прынцыпаў іх фарміравання, увёў вызначэнні механікі металапалімерных сістэм як са мастойнай галіны фізіка-хімічнай механікі матэрыялаў. Гэтыя вызначэнні і класіфікацыі надрукаваны ў шэрагу навуковых прац, уключаны ў энцыклапедычныя выданні. Прымаў актыўны ўдзел у шматлікіх навуковых канферэнцыях і сімпозіумах, у т. л. міжнародных (ЗША, Германія). Член Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі. Член савета фонда фундаментальных даследаванняў Беларусь Член рэдакцыйных калегій часопісаў «Трение и износ», «Известия АН Беларуси. Серия физико-технических наук». Старшыня спецыялізаванага савета па прысуджэнні вучонай ступені доктара тэхнічных навук (Інстытут механікі металапалімерных сістэм Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі). Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (1979). Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола СССР 1973 г.